Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 САКАВІКА 2018 г. ЧАЦВЕР № 60 (28676)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Гісторыі з шафы



Як нарадзіць лёгка?



Незвычайныя хобі мужчын

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:**

*«Бізнес павінен стаць драйверам эканамічных працэсаў у краіне. Для гэтага трэба ўмацоўваць крэдыт даверу паміж дзяржавай і бізнесам. Адным з элементаў рэгулявання з'яўляецца стабільнае і простае падатковае заканадаўства. У сваю чаргу фіскальная палітыка павінна быць накіравана на эканамічнае развіццё, і ў яе аснове неабходна ствараць умовы для праяўлення прадпрымальніцкай ініцыятывы і раскрыцця патэнцыялу прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці. Летась у краіне быў прыняты беспрэцэдэнтны пакет дакументаў, накіраваны на развіццё прадпрымальніцтва. У ім рэалізаваны адзін з ключавых падыходаў аб мінімальным умяшанні дзяржавы ў эканоміку суб'ектаў гаспадарання пры павышэнні асабістай адказнасці іх кіраўнікоў».*

ISSN 1990 - 763X

# Пад крэўскім ветрам



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Ландшафт старажытнай вёскі Крэва Смаргонскага раёна дапаўняюць сучасныя ветравыя энергаўстаноўкі. Адна з гэтых альтэрнатыўных крыніц энергіі знаходзіцца паблізу дарогі, якая вядзе ў суседні Маладзечанскі раён, да вёскі Лебедзева.**

■ Навацыі ў адукацыі

## КАГО ЗАЛІЧАЦЬ У ПРОФІЛЬНЫ КЛАС?

**Пастановай Міністэрства адукацыі ад 3 сакавіка 2018 года № 10 унесены змяненні і дапаўненні ў Палажэнне аб установе агульнай сярэдняй адукацыі.**

— Гэты дакумент прымаўся яшчэ ў 2011 годзе, таму была неабходнасць яго адкарэктаваць з улікам многіх новых абставін і прывесці ў адпаведнасць з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб прыёме ва ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі і навучанні ў іх», — растлумачыла **начальнік галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Святлана УКЛЕЙКА.**

У прыватнасці, цяпер у палажэнні зафіксаваная магчымасць навучання ў класах з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні (раней у дакуменце гэтага пункта не было). Прычым такія класы ці групы могуць стварацца ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі не толькі на трэцяй, але і на другой ступені адукацыі. Для таго каб прэтэндаваць на залічэнне ў профільны клас на старшай ступені школы (10-11 класы), трэба мець сярэдні бал пасведчання аб агульнай базавай адукацыі не ніжэй за шэсць балаў, а па вучэбных прадметах, што будуць вывучацца на павышаным узроўні, не менш за сем балаў.

— Для старшай ступені школы нічога не змянілася — такія ж патрабаванні для залічэння ў класы з павышаным узроўнем вывучэння асобных прадметаў дзейнічалі і раней, — удакладніла Святлана Уклейка. — А на другой ступені навучання конкурсны адбор у класы, дзе пэўныя прадметы будуць вывучацца на павышаным узроўні, увогуле не прадугледжаны. Не будзе больш экзаменаў і ў пятыя класы гімназій.

СТАР. 3

## ЧАКАННЕ СЯЎБЫ

**Летась у гаспадарцы «Малінаўка-Агра», што ў Лоеўскім раёне, у сярэдзіне сакавіка з мехдвара стартавалі трактары. Сёлета на палях яшчэ ляжыць снег. Нават прагназаваць, калі глеба сагрэецца да неабходных +5 градусаў, ніхто не бярэцца. Толькі калі ўсталюецца цёплае надвор'е, можна будзе пачынаць сеяць. А пакуль уся тэхніка на лінейцы гатоўнасці.**



**Трактары ў КСУП «Малінаўка-Агра» на лінейцы гатоўнасці.**

Завяршаюцца работы ў майстэрнях сельгаспрадпрыемства «Малінаўка-Агра». Рыхтуецца да выхаду ў поле энерганасычаная тэхніка і кукурузныя сеялкі. Механізатар з 25-гадовым стажам Радзій Ібрагімаў рамантуе сеялку, а потым сядзе ў трактар, каб араць зямлю. Ён кажа, што ўжо вельмі хочацца змяніць замкнутае памяшканне майстэрні на неабсяжныя прасторы палёў:

— Канешне, усе ўжо вельмі чакаюць, калі ў поле выйдзе тэхніка.

Па ацэнцы гатоўнасці тэхнікі да пасяўной гаспадарка спрацавала няДрэнна — 98 % сельгасмашын падрыхтавана. Цалкам адрамантаваны пасяўныя і камбінаваныя глебаапрацоўчыя агрэгаты, дыскавыя бароны. Тэрміны для пасеву ранніх яравых культур — усяго 10—12 дзён. Карэктывы ў планы пасяўной можа ўнесці толькі надвор'е, гаворыць **дырэктар камунальнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Малінаўка-Агра» Васіль ГЛЕЗАЎ:**

СТАР. 4

■ Малая радзіма

# НОВАЯ ГАСЦІНІЦА І ВУГОР НА ПАСТАМЕНЦЕ

## Што яшчэ плануецца ў Мядзеле да абласных «Дажынак»

**Мядзел рыхтуецца да абласнога фестывалю-кірмашу працаўнікоў сяла «Дажынкі». Пра тое, што для мясцовых уладаў і жыхароў — гэта неардынарная падзея, можна здагадацца ўжо на пад'ездзе да горада з боку Мінска. На абочыне аўтатрасы вядзе «раскопкі» экскаватар.**

— Тут уладкуем невялікія вадаёмы, — уводзіць у курс справы **галоўны інжынер Мядзельскай жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзімір ШАБОВІЧ.** — Як бачыце, мясцовасць нізінная, што паспрыяе запаўненню іх вадой. Ды і пасля вясновага разводдзя тут збярэцца шмат вільгаці, застанецца толькі акультурыць тэрыторыю вакол.

Падчас падрыхтоўкі да «Дажынак» ЖКГ сумесна з упраўленнем капітальнага будаўніцтва райвыканкама распрацавалі план, які прадугледжвае ўладкаванне шматлікіх аб'ектаў.

Практычна ні адзін прыём грамадзян у Мядзеле не абыходзіўся без водных праблем: там прарве трубу, там падтопіць прысядзібны ўчастак. Прычына — зношанасць адпаведнай інфраструктуры. Акрамя таго, колькасць жалеза ў вадзе перавышала дапушчальныя нормы. Таму ў першую чаргу гэтым пытанням удзялілі належную ўвагу: прабурылі дзве свідравіны, якія закальцуюць новы водапровод у адну сістэму і дазволяць палепшыць якасць вады.

Улады разумеюць, што адначасова выканаць усё нерэальна. Каб пазбегнуць аўралу, уладкаванне ў населеным пункце пачалі да наступлення тых сапраўднай зімы яшчэ летась. У лістападзе-снежні прыступілі да земляных работ па замене і будаўніцтве водаправоднай і каналізацыйнай сістэм. Яны працягваюцца і цяпер. У Мядзеле пракладзена каля 9 кіламетраў новых труб, заменена 800 метраў каналізацыйных сетак. Усяго ж да пачатку «Дажынак» планецца памяняць і пракласці каля 11,5 кіламетра водаправодных сетак. На гэтыя мэты маркуецца затраціць салідную суму — каля 1,5 млн рублёў. У райцэнтры і ў курортным пасёлку Нарач будзе заменена 3,2 кіламетра цеплатрасы.



Галоўны інжынер ЖКГ Уладзімір ШАБОВІЧ і прараб ТАА «Сангранд» Дзмітрый ЖУРЫК на будаўніцтве новай гасцініцы.



Пракладка водапровода.

Папрыгажэюць і стануць больш камфортнымі для пражывання і жылыя дамы, мясціны, якія прылягаюць да жыллёвага сектара. Капітальны рамонт пройдзе ў шасці шматпавярховіках і на дзвюх прыдамавых пляцоўках, яшчэ чатырнаццаць дамоў і пяць дваровых тэрыторый чакае бягучы рамонт. А пяць з паловай кіламетраў вуліц заасфальтуюць.

Вядома, наводзіць прыгажосць у горадзе будуць усёй талакой. Кожная арганізацыя, прадпрыемства, установа адукацыі, культуры, аховы здароўя маюць свой план дзеянняў па добраўпарадкаванні прылеглых тэрыторый, будынкаў, стадыёнаў, аб'ектаў фізкультуры і спорту. Усе вуліцы без выключэння збіраюцца прывесці ў належны стан, высадзіць дэкаратыўныя кусты, маладыя дрэўцы, а таксама 60 тысяч кветак. У цяплiцах ЖКГ, школ для гэтых мэт ужо зелянее расада.

Змены таксама закрануць набярэжную, пляжную зоны. Тут плануецца замяніць і ўсталяваць гульнявыя дзіцячыя пляцоўкі, душавыя кабіны, санвузлы. Рэканструкцыя чакае і амфітэатр, які пасля ўладкавання пяройдзе ў падпарадкаванне аддзела культуры. Значна папрыгажэе і цэнтральная гарадская плошча Леніна.

Малыя архітэктурныя формы з'явяцца на вуліцах і ў дварах шматпавярховых дамоў. Ужо ёсць прапановы, распрацаваныя эскізы. Мядзельшчына славіцца сваімі азёрамі, разнастайнымі відамі рыб. Таму яны і будуць адлюстроўваць гэтую тэматыку. У прыватнасці, з'явіцца вугор на пастаменце.

Ну, і самае галоўнае, у райцэнтры дабудуюць гасцініцу на 105 месцаў, якую раней не маглі закончыць з-за недахопу фінансавання.

— Зараз вядзём унутраныя работы, азздабленне, — сказаў **прараб таварыства з абмежаванай адказнасцю «Сангранд» Дзмітрый ЖУРЫК.** — У другім квартале плануем увесці ў дзеянне.

— Будаўніцтва новых аб'ектаў у нас не запланавана. Давядзём да ладу, прывядзём у належны выгляд тое, што ёсць,— канстатаваў Уладзімір Шабовіч.

Дадам, што ў Мядзеле не маюць намеру прыцягваць да ўладкавання арганізацыі з іншых гарадоў. Усе работы вядуцца сваімі сіламі — ДРБУ-133 і ДЭУ-66 — у штатным рэжыме.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Анатоля БАСАВА** ■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ АЛЕГ АНОФРЫЕЎ



На 87-м годзе жыцця ў Маскве памёр вядомы савецкі і расійскі акцёр Алег Анофрыеў. Пра гэта распавёў акцёр і тэлевядучы Аляксандр Алешка. Паводле яго слоў, артыст памёр днём 28 сакавіка, перадае RT. Ён таксама назваў Анофрыева самым выдатным і дзіўным артыстам, «голасам нашага дзяцінства». «У дзень жалобы па дзецях паляцеў, як анёл-захавальнік дзяцей, у гэтым ёсць нейкі знак», — рэзюмаваў Алешка. Голас Анофрыева гучыць у многіх савецкіх і расійскіх фільмаў і мультфільмаў. У «Брэменскіх музыкантах» ён выканаў усе мужчынскія партыі, спяваў і за Трубадура, і за лясных разбойнікаў, і за ўсіх жывёл. Менавіта Анофрыеў выканаў песню «Спяць стомленыя цацкі» для перадачы «Добрай ночы, малыя» і песню «Ёсць толькі міг між мінулым і будучым» з фільма «Зямля Саннікава». Бывайце, Алег Андрэевіч...

### З АМЕРЫКАНСКАЙ ВАЛЮТЫ Ў ЕЎРА МОЖА БЫЦЬ ПЕРАВЕДЗЕНА БОЛЬШ ЗА $500 МЛРД

Найбуйнейшыя цэнтральныя банкі свету на фоне палітыкі пратэкцыянізму прэзідэнта ЗША Дональда Трампа маюць намер скарачаць уласныя запасы ў доларах і нарошчваць рэзервы ў еўра. Пра гэта паведамляе Bloomberg са спасылкай на аналітыкаў. Цяпер асноўная доля ўсіх сусветных валютных рэзерваў (каля 64 працэнтаў) захоўваецца ў амерыканскай валюце, доля еўрапейскай валюты складае 20 працэнтаў. Аднак, паводле ацэнак аналітыкаў, умовы для куплі еўра цяпер «прывабныя, як ніколі». Пры гэтым бягучае становішча спраў на рынку не спрые росту прывабнасці амерыканскай валюты, піша агенцтва. Як адзначыў адзін з вядучых аналітыкаў Уол Стрыт Енс Нордвіг, кіраўнікі найбуйнейшых цэнтрабанкаў ужо пачалі праяўляць цікавасць да куплі еўрапейскай валюты, і да 2020 года, як чакаецца, з амерыканскай валюты ў еўра можа быць пераведзена больш за 500 мільярдаў долараў.

### У М'ЯНМЕ АБРАЛІ НОВАГА ПРЭЗІДЭНТА

Парламенцкім галасаваннем новым прэзідэнтам М'янмы абраны 66-гадовы У Він М'інт, кандыдат ад партыі Нацыянальная ліга за дэмакратыю (НЛД) і былы спікер ніжняй палаты парламента. Вынікі сумеснага галасавання абедзвюх палат Асамблеі Саюза (парламента) былі абвешчаны ў эфіры парламенцкага тэлеканала краіны. Па м'янманскай канстытуцыі прэзідэнта абірае парламент з раней абраных са складу дэпутатаў парламента трох віцэ-прэзідэнтаў. Папярэдні прэзідэнт М'янмы У Тхін Чжо выйшаў у адстаўку на мінулым тыдні, спаслаўшыся на неабходнасць у адпачынку пасля доўгай напружанай працы.

■ Смуткуем

# З БОЛЕМ У СЭРЦЫ

**Беларусы разам з расійскім народам перажываюць гора ў сувязі з трагедыяй у Кемераве**

**Пра гэта заявіла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля КАЧАНАВА, наведваючы пасольства Расіі ў Мінску, каб ушанаваць памяць аб загінулых у выніку трагедыі: «Расіяне — наш братэрскі народ. Страшная трагедыя, якая змяніла лёсы жыхароў Кемерава, адгукнулася несціханым болем у сэрцах нашага народа. Мы сёння ў гэтым страшным горы разам з расіянамі, мы смуткуем», — сказала Наталля Качанава.**



Фота БЕЛТА.

Па даручэнні кіраўніка дзяржавы ў Беларусі ў знак смутку і салідарнасці з Расіяй, дзе 28 сакавіка абвясцілі нацыянальную жалобу ў сувязі з трагедыяй у Кемераве, прыспушчаны дзяржсцягі і адменены забаўляльныя праграмы ў тэлеэфіры. «Беларускі і расійскі народы — гэта самыя сяброўскія людзі. І ў бядзе, і ў радасці — мы разам», — адзначыла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. Наталля Качанава прызналася, што цалкам перадаць свае пачуцці проста немагчыма. «Пра гэта цяжка казаць, пра гэта цяжка маўчаць. Я ўпэўнена, што ў кожнай беларускай сям'і думаюць аб той страшнай трагедыі, якая здарылася ў блізкай нам краіне, Расіі. Вядома, мы разумеем, што знайсці словы суцяшэння для родных і блізкіх проста немагчыма, але калі мы разам, гэта гора пераносіцца лягчэй», — перакананая яна ■

■ Падрабязнасці

# НА БАРАЦЬБУ З ПАВОДКАЙ — 16 АТРАДАЎ

**У найбліжэйшыя дні ў Беларусі істотна пацяплее. Чакаецца, што ўжо на выхадных слупок тэрмометра пяройдзе праз адзнаку ў плюс дзесяць градусаў. Снег пры такіх умовах надвор'я будзе сыходзіць імкліва. Але дзе ўжо цяпер назіраецца «вялікая вада»?**

— Зараз узроўні вады перавышаюць небяспечныя высокія адзнакі на Прыпяці каля вёскі Чэрнічы Жыткавіцкага раёна і Петрыкава, а таксама на рацэ Случ каля вёскі Ленін, — паведаміў **начальнік Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Раман ЛАБАЗНОЎ.** — Толькі два сантыметры да небяспечнай адзнакі застаецца на Прыпяці каля Мазыра, васьмі сантыметраў не хапае на Убарці каля вёскі Краснабярэжжа Лельчыцкага раёна.

Таксама назіраецца падтапленне ўчастка аўтамабільнай дарогі, дзвюх вуліц і падворка ў Петрыкаўскім раёне, аднаго падворка ў Мазыры, 29 падворкаў у Стаўбцоўскім раёне. Каб максімальна зменшыць наступствы паводкі ў Беларусі, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях прыняло комплекс мер.

— Сярод іх — аднаўленне праблемных участкаў і ахоўных дамбаў, ліквідацыя ўсіх відаў пашкоджанняў, ачыстка водаправодных збудаванняў ад старонніх прадметаў і лёду для беспрашкоднага пропуску па іх паводкавых водаў, — расказвае **намеснік начальніка ўпраўлення аварыйна-выратавальных службаў і ліквідацыі надзвычайных сітуацый МНС Анатоль БАЛЯБІН.** — Удакладняюцца населеныя пункты, дзе прагназуюцца магчымыя падтапленні, колькасць людзей, якія там пражываюць, вызначаюцца месцы часовага размяшчэння вывезеных матэрыяльных каштоўнасцяў і жывёл. Таксама мы прапрацоўваем своечасовую эвакуацыю цяжкахворых, нямоглых, адзінока пражываючых грамадзян.

У краіне створана 16 зводных атрадаў для рэагавання на магчымыя надзвычайныя сітуацыі, звязаныя з падтапленнем. Сілы і сродкі МНС пры неабходнасці могуць быць перадыслакаваныя ў любы пункт вобласці, у якім яны павінны знаходзіцца, на працягу 3-4 гадзін або ў любы пункт краіны на працягу шасці гадзін. У іх маецца запас прадуктаў, гаруча-змазачных матэрыялаў, неабходнае абсталяванне, якое дазволіць аўтаномна працаваць трое сутак.

У цэлым жа сітуацыя з паводкай абяцае быць спакойнай.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК** ■

# КАГО ЗАЛІЧАЦЬ У ПРОФІЛЬНЫ КЛАС?

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Вучні, якія атрымалі пачатковую адукацыю ў гімназіях і гімназіях-інтэрнатах, па жаданні могуць працягнуць навучанне ў тых жа ўстановах на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Але ёсць адзін нюанс: прыём асоб для атрымання базавай адукацыі ў гімназіях-каледжах мастацтваў будзе ажыццяўляцца па конкурсе на падставе праверкі іх здольнасцяў у галіне асобных відаў мастацтва. Гэта значыць, што творчае выпрабаванне для іх застаецца, а мову і матэматыку яны больш не здаюць.

Тыя, хто скончыў дзевяць класаў у гімназіі, змогуць і далей — без іспытаў і праверкі творчых здольнасцяў — працягнуць навучанне ў 10 і 11 класах. Здараецца, што ў дзясятым класе ў гімназіях з'яўляюцца свабодныя месцы. Тых, хто будзе на іх прэтэндаваць, чакаюць два ўступныя экзамены па прадметах, якія тут вывучаюцца на павышаным узроўні (экзамены прадугледжваліся і раней). Гэта можа быць дыктант, дыктант з граматычным заданнем, тэставыя заданні, кантрольная работа ў пісьмовай форме, тэарэтычныя пытанні для правядзення экзамену ў вуснай форме, тэарэтычныя пытанні і практычныя заданні для правядзення ўступных іспытаў пры спалучэнні вуснай і практычнай формаў. Тэрмін правядзення экзаменаў — з 2 па 12 жніўня.

Экзамены ў 10 клас ліцэяў будуць арганізаваныя з 16 па 20 чэрвеня. Будучыя ліцэісты здаюць два ўступныя іспыты з ліку вучэбных прадметаў, вызначаных вучэбным планам для вывучэння на павышаным узроўні. Гэта могуць быць не толькі матэматыка і фізіка ці матэматыка і інфарматыка, а, напрыклад, матэматыка і хімія.



Таксама Святлана Уклейка звярнула ўвагу яшчэ на адзін важны нюанс: дакументы ад бацькоў аб прыёме іх дзяцей у першы клас цяпер будуць прымацца не з 2 чэрвеня, як было раней, а з 12 чэрвеня па 28 жніўня. Паколькі ў першай дэкадзе месяца ва ўстановах адукацыі ідуць выпускныя экзамены, праходзяць выпускныя вечары, было вырашана пасунуць гэты тэрмін, каб не ўскладаць на педагагічны калектыў залішнюю нагрузку.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Спорт-тайм

# АЗАРАНКА ШТУРМУЕ МАЯМІ

**1.** ***Вікторыя Азаранка атрымала чацвёртую перамогу запар на турніры ў амерыканскім Маямі і выйшла ў паўфінал.*** У 1/4 беларуска абыграла шостую ракетку свету чэшку Караліну Плішкаву — 7:5, 6:3. Сустрэча працягвалася крыху больш за паўтары гадзіны.

Нагадаем, перад гэтым Вікторыя перамагла амерыканак Кэтрын Беліс і Мэдысан Кіз, а таксама латвійскую тэнісістку Анастасію Севаставу. У паядынку за выхад у фінал Азаранка згуляе з амерыканкай Слоан Стывенс, якая знаходзіцца на 12-м радку сусветнага рэйтынгу.

*— Перад матчам 1/4 фіналу я казала, што гэта будзе выдатная праверка для ацэнкі маёй гульні. Я бачу нямала пазітыву для працягу працы,* — расказвае Вікторыя. — *Прыемна назіраць, што па ходзе турніру я дамагалася вялізнага прагрэсу — з першага раўнда і да сустрэчы з саперніцай з топ-5. Хочацца і далей рухацца па гэтым шляху. Думаю, я ндрэнная тэнісістка і ведаю, як выйграваць матчы. У мяне вялікі вопыт. Мне важна заставацца здаровай, працягваць дадаваць і мець магчымасць гуляць. Я ўвесь час думаю аб магчымасці заваяваць трафей. Менавіта таму і гуляю. Я не прыязджаю на турніры проста пагуляць, але пры гэтым заўсёды рухаюся ад матча да матча. Многія думаюць, што тытул ужо блізкі, але я лічу, што шлях яшчэ далёкі. Да апошняга розыгрышу будзе нялёгка. Я хачу канцэнтравацца на кожным матчы і розыгрышы.*



Адзначым, што раней, калі Вікторыя даходзіла да паўфіналу турніру ў Маямі, то ў выніку абавязкова заваёўвала трафей. Тэнісістка перамагала на гэтым турніры ў 2009, 2011 і 2016 гадах.

**2.** ***Футбалісты нацыянальнай зборнай Беларусі перамаглі ў гасцях каманду Славеніі 2:0 у другім таварыскім матчы новага сезона.*** Галы на рахунку Максіма Скавыша і Антона Сарокі.

*— Структура, над якой мы працавалі, паступова прагледжваецца,* — адзначае **галоўны трэнер зборнай Беларусі Ігар КРЫВУШЭНКА.** — *Так, момантамі ёсць бязладдзе, але па меншай меры структура ўжо відаць, і патрабаванні, якія просім, хлопцы стараюцца выконваць. Самае галоўнае — на полі была каманда. Ніхто асабліва не выпаў, змагаліся адзін за аднаго. Добра, што два матчы зборная згуляла «на нуль», гэта значыць, нядрэнна згуляла абарона, без відавочных памылак.*

Свае наступныя кантрольныя матчы падапечныя Ігара Крывушэнкі правядуць у пачатку лета: 6 чэрвеня ўдабудзецца дамашні спарынг з камандай Венгрыі, 9 чэрвеня — гасцявы супраць Фінляндыі.

**3.** ***Фінальная серыя плэй-оф чэмпіянату Беларусі па хакеі ў экстралізе стартавала ў Гродне.*** У барацьбе за галоўны трафей — Кубак Прэзідэнта — змагаюцца «Нёман» і мінскае «Юнацтва». Абодва клубы з'яўляюцца найбольш тытулаванымі ў беларускай экстралізе. Мінская каманда — сяміразовы чэмпіён краіны, каманда з Гродна шэсць разоў станавілася пераможцам.

Па выніках фіналу плэй-оф вызначыцца колькасць месцаў для Беларусі ў хакейнай Лізе чэмпіёнаў на наступны сезон.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

## На слыху

# АБДЫМКІ З КАСАЛАПЫМ

## У Віцебскім раёне мядзведзь пакусаў беспрацоўнага

**У інтэрнэце актыўна абмяркоўваецца навіна пра тое, што мядзведзь у Віцебскім раёне пакусаў мужчыну. З укусамі рук, бока, спіны і г. д. беспрацоўны, якому за 40, быў шпіталізаваны. Незвычайнае надзвычайнае здарэнне адбылося ноччу на выхадных у вёсцы Пукшына, дзе жывуць 72 чалавекі. Яна прыкладна за 12 км ад Расіі, на тэрыторыі Янавіцкага сельсавета.**

Кіраўнік сельсавета Аляксандр Ізобаў, каб высветліць падрабязнасці, ездзіў у населены пункт.

Паводле слоў суразмоўцы, верагодна, гэты мядзведзь ужо не першы раз выходзіў да людзей. І аднакласнік старшыні нават зрабіў фота касалапага, вельмі падобнага на таго, якога бачылі вяскоўцы. Версій, як сустрэліся жывёла і чалавек незадоўга да здарэння, у інтэрнэце існуе некалькі. Але старшыня сельсавета пацікавіўся дробязямі на месцы. Таварыш пацярпелага, які прагнаў мядзведзя, кінуўшы ў яго рондаль, сцвярджаў, што аднавясковец абдымаўся з мядзведзем. Апошні яго лізаў. Навасьпечаны сябар жывёлы нават прапанаваў разам выпіць «на траіх»... Справа скончылася тым, што мядзведзь падмяў пад сябе чалавека і пачаў кусаць.

Пацярпелага цяпер лечаць у Віцебску. У сельскім выканкаме яго характарызуюць адмоўна. Напрыклад, ён на ўліку ў грамадскім пункце правапарадку. Пры жаданні мог бы працаваць на ферме, дзе дастойны заробак, але не хоча.

У дзень напісання артыкула ў Віцебскім райвыканкаме адбылося мерапрыемства па лініі МНС. Абмяркоўвалі і інцыдэнт. Як сцвярджаюць вопытныя паляўнічыя, калі мядзведзь напаў на чалавека, сітуацыя можа і паўтарыцца. А забіць жывёлу нельга, бо мядзведзь занесены ў Чырвоную кнігу. Для гэтага неабходны дазвол у адпаведных інстанцыях па ахове жывёльнага свету. Як варыянт, мядзведзя можна было б злавіць і перасяліць падалей ад людзей.

Дарэчы, візіты мядзведзяў у вёскі Віцебскага раёна не рэдкасць. Старшыня Янавіцкага сельсавета, дарэчы, раней працаваў майстрам у лягасе. Ён адзначыў, што мядзведзі часта падыходзяць да месцаў, дзе жывуць людзі, а яшчэ прыгадаў, што ўпершыню мядзведжыя сляды ўбачыў каля 20 гадоў таму. А вось мінулым летам з-за лясных пажараў у Расіі касалапых у раёне стала болей. Аднаго бачылі жыхары вёскі Лазаватка ў суседнім Задуброўскім сельсавеце. Як канстатавалі тады ў Віцебскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, канешне, у пошуках ежы ён не вернецца ў расійскія лясы. І пры неабходнасці паабяцалі адлавіць звера...

Што будзе з мядзведзем, які параніў чалавека, пакажа час.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

## ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### ГРОШЫ ЗА... НЯБОЖЧЫЦУ

**Мінчанін 30 гадоў атрымліваў пенсію сваёй маці, якая памерла ў 1988 годзе**

**У Маскоўскае РУУС сталіцы звярнуліся работнікі тэрытарыяльнага органа сацыяльнай абароны для ўстанаўлення месцазнаходжання найстарэйшай жыхаркі Мінска 1904 года нараджэння. Яны некалькі разоў спрабавалі наведаць жанчыну па месцы жыхарства, аднак яе сын сцвярджаў, што тая пражывае ў сельскай мясцовасці Гродзенскай вобласці.**

У ходзе праверкі было ўстаноўлена, што жанчына памерла яшчэ ў 1988 годзе ва ўзросце 84 гадоў. Сваякі жанчыну пахавалі, аднак сын памерлай схаваў ад органаў сацыяльнай абароны факт смерці маці і з таго часу атрымліваў яе пенсію ў банку па даверанасці.

Па інфармацыі Маскоўскага РУУС сталіцы, мужчына 1943 года нараджэння не працуе, з'яўляецца пенсіянерам. Прыкладная сума шкоды складае больш за 100 000 рублёў. У рамках расследавання крымінальнай справы разглядаюцца ўсе абставіны, скіраваныя на атрыманне грашовых сродкаў шляхам падману. Па яго выніках будзе вызначана канчатковая сума шкоды.

У дачыненні да мужчыны распачата крымінальная справа за махлярства. Максімальнае пакаранне па ёй — пазбаўленне волі на тэрмін да сямі гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

### ГРУЗАВІК СУПРАЦЬ... БТРА

**У Бярозе «МАЗ» сутыкнуўся з бронетранспарцёрам.**

Па інфармацыі Міністэрства абароны, здарэнне мела месца а сёмай гадзіне раніцай на скрыжаванні. Кіроўца цывільнага грузавіка «МАЗ» парушыў правілы дарожнага руху, праігнараваў сігналы машын ДАІ і ВАІ, якія суправаджалі арганізаваную калону ваенная тэхнікі, і здзейсніў сутыкненне з бронетранспарцёрам. У выніку гэтага ДТЗ кіроўца грузавіка атрымаў траўму нагі і быў дастаўлены ў бальніцу для аказання медыцынскай дапамогі. Па факце аварыі разбор праводзяць ДАІ і Следчы камітэт.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ПАЛІЎ СМЕЦЦЕ — ЗГАРЭЎ ДОМ

**Навядзенне парадку абярнулася сапраўднай бядой для 58-гадовага жыхара вёскі Скорцы Пружанскага раёна.**

Мужчына згроб смецце, сухую траву і падпаліў усё гэта на падворку. Але ж агонь, як вядома, па сухой траве распаўсюджваецца імгненна. І гаспадар не паспеў азірнуцца, як полымя «дабегла» да хаты і перакінулася на драўляную пабудову. У выніку згарэў дах, пашкоджаны сцены, маёмасць. Па сутнасці, чалавек застаўся без дома. Пра гэты факт расказаў **афіцыйны прадстаўнік Брэсцкага абласнога МНС Сяргей МАШНОЎ.** І яшчэ адзін пажар зафіксаваны ў апошнія дні. На гэты раз з-за спальвання сухой травы загарэліся гаспадарчыя пабудовы ў садовым таварыстве «Лотас» Брэсцкага раёна. Знішчаны чатыры хлявы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# Уладзімір Дамашэвіч у «Беларускім кнігазборы»

**Пабачыў свет 95-ы том у серыі «Беларускі кнігазбор». Гэтым разам прадстаўлены проза і публіцыстыка пісьменніка, якога можна смела лічыць сумленнем беларускай літаратуры, — Уладзіміра Максімавіча Дамашэвіча.**

У зборнік, укладзены Генрыхам Далідовічам — малодшым таварышам празаіка, увайшлі апавяданні, аповесць «Між двух агнёў», раман «Камень з гары», публіцыстыка. Найлепшае з творчай спадчыны Уладзіміра Дамашэвіча (1928—2014) сведчыць пра надзвычай выразнае імкненне пісьменнікаў яго пакалення пісаць праўду. Быў Васіль Быкаў, быў Алесь Адамовіч, але поруч ішлі яшчэ літаратары, творы якіх і зараз можна смела лічыць мастацкімі дакументамі праўдзівага адлюстравання беларускай рэчаіснасці, — Вячаслаў Адамчык, Аляксей Карпюк і, канешне ж, Уладзімір Дамашэвіч. Яго раман «Камень з гары», напісаны напрыканцы 1960-х — у пачатку 1970-х гадоў, 20 гадоў знаходзіўся пад забаронай. Публікацыя ў 1990 годзе высокапрадзівага твора, прысвечанага жыццю і творчай інтэлігенцыі і ўвогуле ўсёй Беларусі на пэўным адрэзку часу, стала прыкметнай падзеяй у беларускім літаратурным працэсе.

З цікавасцю чытаюцца і публіцыстычныя артыкулы, сабраныя ў кнізе. Многія пазіцыі, выкладзеныя ў нарысах, прамовах на пісьменніцкіх з'ездах, якія друкаваліся ў «Маладосці», «Полымі», «Крыніцы», актуальныя і зараз. Як для літаратуры, так і для грамадскага жыцця.

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ Фінансы

# НАЦБАНК ПАДКАРЭКТУЕ ФОРЭКС

## Пры правядзенні дзелавых перагавораў плануецца запісваць і захоўваць тэлефонныя размовы з кліентамі

**У Беларусі да канца года плануюць удасканаліць заканадаўства, якое рэгулюе рынак Форэкс, паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення метадалогіі нябанкаўскіх аперацый галоўнага ўпраўлення рэгулявання некрэдытных фінансавых арганізацый Нацыянальнага банка Аляксей УЛАСАЎ. Пра гэта эксперт Нацбанка заявіў на канферэнцыі Асацыяцыі развіцця фінансавага рынку (АРФІН), якая сабрала вядучых прадстаўнікоў галіны для падвядзення вынікаў работы на пазабіржавым рынку Форэкс у мінулым годзе, а таксама для абмеркавання галоўных тэндэнцый развіцця сёлета.**



### Для падстрахоўкі

Прадстаўнік рэгулятара расказаў, што ўжо распрацаваны праект указа, які будуць унесвыя змены ў работу пазабіржавога рынку Форэкс. «Цяпер ён знаходзіцца на ўзгадненні ў органах дзяржаўнага кіравання. Прыняцце і ўступленне дакумента ў сілу плануецца ў канцы года, але гэта будзе залежаць ад працэдуры ўзгаднення», — растлумачыў ён.

У прыватнасці, плануецца ўкараніць патрабаванне аб запісе і захоўванні тэлефонных размоў з кліентамі. «Гэта дазволіць пазбегнуць непрадбачаных момантаў пры разборы сітуацый, звязаных з цэнамі на базавыя актывы, іншых момантаў, якія не задавальняюць кліентаў у працы з форэкс-кампаніямі, пацвердзіць тое ці іншае меркаванне, пазіцыю па аперацыях», — адзначыў Аляксей Уласаў. Ён удакладніў, што пакуль запісы тэлефонных размоў мяркуецца захоўваць на працягу года, але гэты тэрмін можа карэктавацца.

### У комплексе

Таксама плануецца ўзмацненне дыстанцыйнага кантролю за аперацыямі на рынку Фор-экс. «Мяркуецца выяўленне аперацый, якія значна адхіліліся ад устаноўленых параметраў — цэн базавых актываў пры адкрыцці і закрыцці пазіцыі. Такія адхіленні сустракаюцца ў нядобрасумленнай практыцы, выяўленнем падобных выпадкаў будзе займацца Нацыянальны форэкс-цэнтр, а параметры будуць устаноўлены Нацбанкам. Само паняцце «істотныя адхіленні» таксама будзе раскрыта ў заканадаўстве», — заявіў спецыяліст.

Аляксей Уласаў падкрэсліў, што беларускае заканадаўства будзе набліжана да еўрапейскага. «Мяркуецца больш поўнае раскрыццё інфармацыі аб дзейнасці форэкс-кампаній не толькі кліентам, але і трэцім асобам. Магчыма, гэта будзе нейкая частка фінансавай справаздачнасці, вынікі працы кампаніі. Праект указа носіць комплексны характар і мяняе нават тэрміналагічныя падыходы. У прыватнасці, плануем, зыходзячы з вопыту ЕС, дадзеную дзейнасць называць інвестыцыйнай. Акрамя таго, плануем гаварыць не пра пазабіржавы рынак Форэкс, а пра рынак беспаставачных пазабіржавых фінансавых інструментаў», — сказаў ён.

### 3 «плюсам»

Аляксей Уласаў расказаў пра вынікі працы рэгуляванага пазабіржавога рынку Форэкс нашай краіны за два гады, якія прайшлі з дня ўступлення ў законную сілу Указа Прэзідэнта Беларусі ад 4 чэрвеня 2015 года № 231 «Аб ажыццяўленні дзейнасці на пазабіржавым рынку Форэкс».

Паводле ацэнак прадстаўніка Нацыянальнага банка, за гэты час створана шматузроўневая сістэма абароны сродкаў кліентаў, абароны правоў спажыўцоў у рамках заканадаўства. Акрамя таго, прыцягнуты замежныя інвестыцыі, створаны рабочыя месцы. І па-трэцяе, уцягнуты зберажэнні грамадзян у эканамічны абарот і прыцягнуты ў краіну грашовыя сродкі нерэзідэнтаў.

Сістэма абароны сродкаў кліентаў, апроч іншага, уключае ў сябе фарміраванне Нацыянальным форэкс-цэнтрам гарантыйнага фонду з дапамогай унясення ўзносаў з боку форэкс-кампаній (на пачатак 2018 года — 820 тысяч долараў), фарміраванне забеспячальнага капіталу (больш за 1 млн долараў), а таксама выкананне суб'ектамі рынку патрабаванняў да іх знешніх контрагентаў. Па стане на 1 студзеня 2018 года каэфіцыент пакрыцця кліенцкіх сродкаў сродкамі гарантыйнага фонду складае больш за 20 %, што практычна ў тры разы перавышае каэфіцыент пакрыцця дэпазітаў насельніцтва, якія захоўваюцца ў банках, сродкамі агенцтва па гарантаванай кампенсацыі ўкладаў фізічных асоб у банкаўскім сектары краіны.

Па даных прадстаўніка Нацбанка, у 2017 годзе сумарны памер сфарміраванага статутнага фонду беларускіх форэкс-кампаній склаў 4 млн рублёў, у тым ліку нерэзідэнтамі ўнесена 3,6 млн рублёў (90 %). Такая высокая доля замежнага капіталу тлумачыцца зразумеласцю профільнага беларускага заканадаўства замежным інвестарам. Гэта забяспечыла стварэнне больш як 100 новых працоўных месцаў.

У цэлым, па словах Аляксея Уласава, летась колькасць кліентаў форэкс-кампаній склала больш за тры тысячы чалавек. Было здзейснена больш за 1 млн аперацый на агульную суму (з улікам маржынальнага пляча) 15,6 млрд рублёў. Больш як 70 % аперацый былі завершаны са станоўчым для кліентаў фінансавым вынікам.

### Кансалідацыя рынку

**Старшыня асацыяцыі развіцця фінансавага рынку Аляксей СІДАРАЎ** адзначыў, што дзейнасць АРФІН летась была накіравана на фарміраванне прававога асяроддзя ўдзельнікаў пазабіржавога рынку Форэкс, павышэнне фінансавай адукаванасці насельніцтва і супрацьдзеянне нядобрасумленным практыкам.

«Для нас вельмі важна не толькі наладзіць супрацоўніцтва паміж дзяржаўнымі органамі і членамі асацыяцыі, але і аказаць падтрымку ўдзельнікам форэкс-рынку і спрыяць іх развіццю на тэрыторыі Беларусі, — сказаў Аляксей Сідараў. — Адным з вынікаў дзейнасці мінулага года з'яўляецца кансалідацыя большасці ўдзельнікаў пазабіржавога рынку Форэкс нашай краіны ў складзе АРФІН. Гэта дазваляе казаць аб іх прыхільнасці ўстойліваму развіццю і аказанню якасных паслуг. Важна таксама адзначыць эфектыўнасць наладжанага супрацоўніцтва асацыяцыі з рэгулятарам, па выніках узаемадзеяння з якім у цэлым улічана больш за 95 % прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства».

### Абараніць патэнцыйных інвестараў

Старшынёй было таксама адзначана, што сёлета плануецца пашырыць дзейнасць па аб'яднанні ўсіх удзельнікаў пазабіржавога рынку Форэкс і працягнуць працу, накіраваную на ўдасканаленне рэгулятарнага асяроддзя, у тым ліку па абароне кліентаў кампаній. Адным з важных напрамкаў работы Асацыяцыі развіцця фінансавага рынку з'яўляецца супрацьдзеянне нядобрасумленнай рэкламе, якая садзейнічае ўключэнню грамадзян краіны ў інвесціраванне сваіх грашовых сродкаў неправеранымі і часам ашуканскім арганізацыям, а таксама наносяць страты рэпутацыі форэкс-кампаній.

**Сяргей КУРКАЧ**

❍ **У тэму**

### ПАШЫРАНЫ ПЕРАЛІК ЗАМЕЖНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

**Пастановай праўлення Нацбанка № 132 пашыраны круг замежных арганізацый, з якімі маюць права ўзаемадзейнічаць беларускія форэкс-кампаніі пры хэджаванні рызык.**

У адпаведнасці з заканадаўствам, беларускія суб'екты пазабіржавога рынку Форэкс абавязаны здзяйсняць аперацыі з беспаставачнымі пазабіржавымі фінансавымі інструментамі выключна з замежнымі фінансавымі інстытутамі, якія ажыццяўляюць дзейнасць у рэгуляваных юрысдыкцыях пад эфектыўным кантролем (наглядам). Пералік такіх юрысдыкцый устанаўліваецца Нацыянальным банкам і на дадзены момант змяшчае 39 арганізацый.

Пастанова № 132 дапаўняе названы пералік Швейцарскай службай па наглядзе за фінансавым рынкам (Swiss Financial Market Supervisory Authority) і Аўстралійскай камісіяй па каштоўных паперах і інвестыцыях (Australian Securities and Investments Commission). Названыя юрысдыкцыі характарызуюцца высокім узроўнем развіцця і ўстойлівасці фінансавага рынку, а таксама эфектыўнай сістэмай прававога рэгулявання і нагляду за яго ўдзельнікамі.

Прынятае рашэнне дазволіць беларускім суб'ектам пазабіржавога рынку Форэкс аптымізаваць працэс кіравання рызыкамі, а таксама забяспечыць стварэнне ўмоў для далейшага эфектыўнага і празрыстага развіцця пазабіржавога рынку Форэкс.

# ЧАКАННЕ СЯЎБЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Укладзена каля 85 тысяч рублёў бюджэтных грошай, дапамога аказана раённым выканаўчым камітэтам, гаспадарка таксама затраціла 30 тысяч рублёў уласных сродкаў на рамонт тэхнікі. У нас трэба засеяць ярэвымі 2900 гектараў. З іх 670 гектараў — ранняя ярэвыя культуры. Насенне падрыхтавана, цяпер канчаткова вырашаецца пытанне з пастаўкамі элітнага насення.

Усяго на землях Лоеўшчыны сёлета трэба пасеяць шэсць тысяч гектараў ранніх ярэвых збожжавых і зернебабовых культур. Галоўная задача галіны раслінаводства раёна — пры невысокім бале ўрадлівасці глебы (24,5) палепшыць паказчык выхаду раслінаводчай прадукцыі з аднаго гектара і атрымаць дастатковую колькасць кармоў, адзначае **намеснік начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Лоеўскага райвыканкама Уладзімір ШАЎЧУК:**

— Каля 70 % зямель раёна складаюць пясчаныя, бедныя глебы. Таму імкнёмся максімальна выкарыстоўваць кожны кавалак зямлі, каб быў максімальны выхад прадукцыі з аднаго гектара. На Лоеўшчыне трэба пасеяць шэсць тысяч ранніх ярэвых збожжавых і зернебабовых культур і звыш 11 тысяч га кукурузы.

Усяго на палетках Гомельскай вобласці гэтай вясной будзе працаваць 5,5 тысячы трактароў. У камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама паведамілі, што парк тэхнікі сельгаспрадпрыемстваў вобласці ўжо папоўніўся новымі энерганасычанымі машынамі, якія створаць рэзервовы фонд. Стануць па сутнасці механізаваным атрадам хуткага рэагавання.

Цяпер у гаспадарках вобласці поўным ходам ідзе вываз на палі арганічных угнаенняў, назапашванне мінеральных угнаенняў, выбарка насення ярэвых культур. На Гомельшчыне вялікая частка плошчаў — 300 тысяч гектараў ужо засеяная азімымі збожжавымі, якія, дарэчы, у добрым стане. А таму, нават калі Гомельшчына пачне сеяць пазней, чым звычайна, ёсць усе шанцы скончыць сяўбу ярэвых збожжавых у аптымальна сціслыя тэрміны.



**Механізатар КСУП «Малінаўка-Агра» Радзій ІБРАГІМАЎ рамантуе кукурузную сеялку.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**



## ЧАЛАВЕК З КЕМЕРАВА

На днях мне прысніўся страшны сон. Быццам бы здымаю інтэрв'ю з дыктафона. Раптам чую гук пажарнай сігналізацыі. Спачатку падумала: проста, як звычайна, правяраюць, ці працуе сістэма. Але, калі пранізлівы гук не знік і праз 10 хвілін, у роспачы выбегла на калідор. Кінулася да аднаго аварыйнага выхаду — заблакаваны, да другога — таксама. Нечакана гукі пажарнай сігналізацыі змяніліся на голас Барыса Грабеншчыкова: «Я позвонил своей маме, / И мама была права — / Она сказала: «Немедля звони / Человеку из Кемерова».

Гэтая песня гучыць у маёй галаве з 25 сакавіка. З таго самага дня, калі ў Кемераўскім гандлёвым цэнтры здарылася трагедыя. Самае жахлівае ў ёй — гэта дзіцячыя званкі...

У той дзень Аляксандр Лілевяль прывёў у «Зімнюю вішню» трох сваіх дачушак (малодшай было пяць гадоў, старэйшым па 11) на мультфільм «Шэрлак Гномс». Набыў ім папкорн і праводзіў у глядзельную залу. А сам спусціўся з 4-га паверха на першы — чакаць канца сеанса. Трывожны званок ад дачкі атрымаў праз паўтары гадзіны... Дзяўчынка сказала тату, што дзверы кіназалы зачыненыя, няма чым дыхаць, шмат дыму. Мужчына, не раздумваючы, кінуўся на дапамогу. Але, надыхаўшыся чадным газам, ледзь не страціў прытомнасць. А дачка ўсё тэлефанавала тату... Гэта гісторыя толькі адной сям'і. Пажар у Кемераве закрануў больш за паўсотні.

Амаль адразу пасля трагедыі ў сацыяльных сетках з'явіліся парады для бацькоў: «Пажар у Кемераве! Навучыце сваіх дзяцей!» «Паспрабавала расказаць Улі пра тэхніку бяспекі падчас пажару, — дзеліцца знаёмая, — у прыватнасці, пра неабходнасць пасікаць на шалік ці іншы прадмет адзення. А яна кажа: «Фу, уяві, мы сабраліся на дзень нараджэння, я надзела прыгожую сукенку, прыйшла ў забаўляльны цэнтр, а там пажар. Як я пасікаю на сукенку, а потым пайду на дзень нараджэння?» Малеча яшчэ не можа зразумець, што дзень нараджэння можа і не настаць...»

Сапраўды, у пяцігадовым узросце дзіця не ўсё можа зразумець. Але тым не менш расказваць пра бяспеку трэба. Прычым, і ў тры гадзікі, і ў пяць, і ў 25. Першае правіла выхаду з задымленага памяшкання — што трэба дыхаць праз мокрую тканіну — павінен ведаць кожны чалавек. Але ж вады з сабой можа не аказацца... Можна таксама пагуляць з дзецьмі ў «Знайдзі выхад». Прыходзячы ў любы будынак, першай справай глядзіце, куды б вы пабеглі ў выпадку пажару.

...Хоць, дай божа, каб гэтыя веды ніколі не спатрэбіліся.

А вось гэта ўжо залежыць выключна ад нас, дарослых. Пасля трагедыі ў Кемераве кожны павінен зазірнуць у сябе. І задаць сабе пытанне: што асабіста я магу зрабіць, каб падобнае не паўтарылася?

Калі вы вырашылі адкрыць гандлёвы цэнтр, у першую чаргу думайце не пра прыбытак, а пра бяспеку людзей, якія давяраюць вам сваё жыццё. Калі вы інжынер па тэхніцы бяспекі, то праводзьце рэальныя інструктажы, курсы эвакуацыі разам з МНС. А не проста, як у нас гэта часта бывае, прыносьце журнал на подпіс. І прадмет АБЖ у школах павінен быць не дзеля галачкі. І калі кожны будзе адказна ставіцца да сваіх абавязкаў, то верагоднасць трагедыі, хочацца верыць, знізіцца да мінімуму.

«Як жа можна было выключыць пажарную сігналізацыю? Як можна было замкнуць дзверы кіназалы? (І куды падзеўся дарослы чалавек з ключом?)» І такіх ЯК чую вельмі шмат апошнімі днямі ад самых розных людзей. Але самае галоўнае пытанне, якое зараз стаіць перад грамадствам: як «разблакаваць» дзверы адказнасці, перастаць спадзявацца на «ўдачу» і «пранясе»?

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**


# Сямейная газета

Выпуск № 6 (97)


■ Чым багатыя?

# СЕЗОНЫ ВЕРЫ,

## АБО Ў ШАФЕ З АДЗЕННЕМ — УСЁ ЖЫЦЦЁ



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**Вера ў плюшавым паліто, якое яна «дастала» па знаёмстве ў краме ў сябе на Валожыншчыне. На ёй хустка з кветкамі, якая называецца шаліноўка. Менавіта гэтая хустка была на Веры, калі яна пазнаёмілася з будучым мужам Сяргеем.**

**Першага студзеня Веры Перапечы споўніўся 91 год. Усё сваё жыццё яна пражыла ў Валожыне. Выйшла замуж, нарадзіла траіх дзяцей, працавала, гадавала ўнукаў. Вера не баіцца старасці і ўспрымае яе як апошні сезон, апошні жыццёвы этап. Яна любіць прыхарошвацца. У шафе з адзеннем — усё яе жыццё. З кожнай сукенкай звязана свая гісторыя, свой успамін.**

***(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)***

■ Прыклад для пераймання

# ФІРМЕННЫ БУЛЁН ЗАМЕСТ ФАСТ-ФУДУ

**Фуд-коўч і аўтар праекта «Маміна ежа» Ксенія ВЯЦКАЯ правяла незвычайны ўрок у сталічнай гімназіі № 23**

**У маім маленстве дзеці звычайна прасілі ў бацькоў купіць што-небудзь салодзенькае. Таму вельмі здзівілася, калі днямі ў краме пачула плач школьніка, які адмаўляўся ісці дадому без... сасісак.**

— Я сваім дзецям ніколі не купляю сасіскі, — рэагуе на маю рэпліку Ксенія Вяцкая. — У іх складзе таксама ёсць цукар і мноства іншых таксічных рэчываў. Больш за тое, сасіскі не даюць дзіцячаму арганізму нічога карыснага, толькі забіваюць страўнік, як папера, і выклікаюць прывыканне...

Пасля гэтых слоў фуд-коўч просіць дзевяцікласнікаў пералічыць свае любімыя прадукты, якія змяшчаюць цукар. «Булачкі, цукеркі, газіроўка...» У гэты момант Ксенія дастае з заплечніка шалі, чарку, цукар і паўлітровую бутэльку папулярнага сяроду моладзі газіраванага напітку. І прапануе правесці эксперымент. Дапамагчы выклікаецца малады чалавек з апошняй парты. Ксенія просіць яго прачытаць на этыкетцы склад напітку. Шляхам нескладаных падлікаў высвятляем, што ў адной бутэльцы на 500 мл змяшчаецца ажно 50 (!) грамаў цукру.

Каб наглядна ўявіць, колькі гэта, Ксенія прапануе свайму памочніку адсыпаць у чарку 50 грамаў цукру. Для дакладнасці карыстаюцца шалямі. Потым такі ж эксперымент правялі з маленькім пачкам дзіцячага соку. Аказваецца ў яго складзе ажно 20 грамаў цукру. І гэта пры тым, што сутачная норма для дарослага чалавека — усяго толькі 6 грамаў.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Таму наталіць смагу старайцеся чыстай вадой, а не цукрам, — раіць Ксенія і робіць некалькі глыткоў вады з бутэлечкі, якую заўсёды носіць з сабой.

— А я як піў газіроўку, так і буду піць, бо яна мне вельмі падабаецца, — данеслася з апошняй парты.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)***

# Фірменны булён замест фаст-фуду

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Ксенія не разгубілася і прапанавала заўзятаму аматару шкоднага напітку новы эксперымент.

— Выпіць 50 грамаў цукру ў выглядзе газіроўкі можа кожны, а вось паспрабуй з'есці яго ўсухамятку.

— Лёгка, — з гэтымі словамі хлопец узяў чарку з цукрам. Але праз секунду выплюнуў яго ў сметніцу.

— Мы ўжываем вельмі шмат «схаванага» цукру, — працягвае ўрок фуд-коўч. — І не задумваемся, што ён траўмуе гены. Праз гадоў дзесяць вам скажа ваш маленькі сын: «Ты піў газіроўку, а цяпер у мяне дрэнныя зубы». З-за злоўжывання цукрам з'яўляецца не толькі карыес, але і прышчы, гастрыт, язва, псуецца шкілет...

Падобныя дабрачынныя ўрокі Ксенія праводзіць для школьнікаў з задавальненнем.

— Прыходзячы да першакласнікаў, я, магчыма, ужо выхоўваю жонку сваім дзецям *(усміхаецца)*. У мяне два сыны і, можа быць, будуць яшчэ. Дзеці — наша будучыня. І хочацца, каб яны былі здаровымі і прыгожымі, а не хадзілі з чорнымі зубамі. Лічу, што ў школах, акрамя звычайных, павінны праходзіць і такія «ўрокі жыцця». Дзецям падабаецца, калі да іх прыходзяць цікавыя людзі, штосьці расказваюць у нефармальных абставінах. Не ва ўсіх бацькі вядуць здаровы лад жыцця, сартуюць смецце, купляюць толькі карысныя прадукты. А дзецям жа аднекуль трэба браць прыклад. Калі я сказала дзевяцікласнікам, што лепш не набываць малако і сокі з пластыкавымі трубачкамі, бо пластык раскладаецца больш за 100 гадоў, яны не паверылі. Даказвалі, што ўсяго адзіндва. Таму я параіла іх класнаму кіраўніку на наступны нефармальны ўрок запрасіць эколага.

У канцы сустрэчы дзевяцікласнікаў хвалявала адно пытанне: а чым можна замяніць булачкі ды шакаладныя батончыкі?

— Замест батончыка з пальмавым алеем ці глазураванага сырка з'ешце лепш яблык — гэта будзе ў сто разоў здаравей. Школьны фаст-фуд можна замяніць карыснымі маркоўнымі палачкамі ці зробленымі дома бургерамі з фаршу з бараніны. Цудоўная альтэрнатыва ласункам таксама сушаная ці запечаная ў духоўцы садавіна, — параіла Ксенія. І прапанавала дзецям па чарзе дома штосьці выпякаць і на вялікім перапынку частаваць аднакласнікаў смакатой. — Дамашняя выпечка больш карысная, чым крамная, у якую, каб працягнуць тэрмін захоўвання, дадаюць розныя хімічныя рэчывы.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

**Топ-5 «здаровых» ссабоек, якія падыдуць, як дзецям, так і дарослым**

**1)** Навучыцеся рабіць разнастайныя салаты з агародніны: печаныя бурак ды морква, запраўленыя правансскімі травамі; сыры бурак з апельсінамі і пятрушкай; брокалі і яблыкі...
**2)** Кавалак дзікай рыбы, прыгатаваны на пары.
**3)** Крэм-суп з любой агародніны.
**4)** Сырнікі ці запяканка.
**5)** Печаная садавіна: яблыкі, грушы.

## ПАРАДЫ БАЦЬКАМ АД КСЕНІІ ВЯЦКАЙ:


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

➢ Часта чую ад мам фразу: «Маё дзіця гэта не есць». Менавіта з яе пачынаецца маніпуляцыя ежай. Сучасныя бацькі ўзносяць сваіх крывіначак на п'едэстал, дагаджаюць ва ўсім. Хоць меркаванне мамы і таты для дзяцей павінна быць аўтарытэтным. Да трох гадоў трэба прывіваць здаровы лад жыцця, тлумачыць, што карысна, што не. І, вядома, самім паказваць прыклад. У мяне з дзецьмі спрацоўвае візуальная частка лікбезу. Як толькі пачынаецца «фу, мы гэта не хочам есці», у нас з мужам ёсць нарыхтаваныя карцінкі карыесу. Раю паглядзець усёй сям'ёй фільм «Цукар». Акрамя таго, у інтэрнэце ёсць мноства займальных адукацыйных дзіцячых фільмаў пра шкоду таго ж самага цукру ці глютэну. Нават самыя вялізныя нехачухі, калі пазбавіць іх магчымасці перакусваць абы-чым, праз два-тры дні рэальна згаладаюцца і з задавальненнем будуць уплятаць булён.

➢ Раю бацькам не ігнараваць субпрадукты, набываць мяса на касцях. З іх атрымліваецца шыкоўны, карысны булён. Выварка з касцей, коснага мозгу — гэта асноўнае пажыўнае рэчыва для арганізма, які расце. Але большасць дарослых чамусьці аддаюць перавагу курыным грудкам, вырашчаным на гармонах. І пры гэтым многія яшчэ ўмудраюцца некалькі разоў зліваць навар, каб было не так тлуста.

Я ўсё дома гатую на косных булёнах. І, як маці, вельмі рада, што кожную раніцу мае дзеці перад тым, як ісці ў садок, просяць некалькі яго лыжачак. Я шчаслівая, бо яны абароненыя. Мне здаецца, я, дзякуючы булёну, дапамагла сваім дзецям быць здаровымі.

➢ Адбіць цягу падлеткаў да фаст-фуду — так званай смеццевай ежы — няпроста, але рэальна. У мяне часта тусуюцца дзеці сястры — школьнікі. Дык вось я заўважыла: галоўнае, каб у доме была ежа і прыгожая абгортка для яе. Калі я ў стылёвы тэрма-кубак наліваю суп-пюрэ, яны з задавальненнем ідуць з ім па горадзе і яго папіваюць. Замест таго, каб есці чыпсы. Тым больш зараз у модзе здаровае харчаванне, і нават падлеткаў можна пераканаць, што гэта крута. Прапануйце сваёй дачцэ: «Пайшлі разам выберам ланчбокс з тваімі любімымі персанажамі. Абклей яго налепкамі і можаш сама складаць усё, што табе падабаецца». Калі ў доме ёсць здаровая ежа, то дзіця яе і пакладзе. А калі адны сасіскі, паўфабрыкаты ды булачкі, дык дзіця, вядома, прыхопіць з сабой менавіта іх, бо гэта прасцей.

➢ Добра, каб дзеці ўдзельнічалі не толькі ў сумесных гатоўках, але і ў закупцы прадуктаў. Разам хадзіце па крамах, чытайце этыкеткі і прымайце рашэнне: што браць, а без чаго можна і абысціся, бо гэта шкодна.

➢ Адмоўцеся ад крамнага кетчупу (маянэзу і іншых соусаў). Набывайце звычайную таматную пасту. Дадавайце ў яе соль, спецыі і трошкі гарачай вады — атрымаецца кетчуп.

➢ Не раю набываць прамысловыя ёгурты. Бо ў іх няма сэнсу. Жывыя бактэрыі не могуць захоўвацца тыднямі. Пачніце гатаваць сапраўдныя жывыя ёгурты самастойна. Гэта не складана. Асабіста я аддаю перавагу фермерскім малочным прадуктам. Зараз лёгка можна знайсці ў інтэрнэце дастаўку хатняга малака, вяршкоў і ўжо самастойна пры дапамозе сухой бактэрыяльнай закваскі рабіць ёгурт. Так, з непрывычкі ўсё гэта здаецца шалёна складаным. Але як падумаю, наколькі складанейшы шлях у кучы выкінутых мною слоічкаў ад ёгурту, — мой выбар на карысць такой дастаўкі тут жа становіцца відавочным. Ды і навошта мне есці ёгурт з адной сумнеўнай бактэрыяй, калі я магу зрабіць ажно з дзевятнаццаццю?

➢ На сваіх кансультацыях я звычайна раздаю мамачкам спіс. Там шмат відаў мяса, гародніны, круп, мукі... Жанчыны прызнаюцца, што большасць з гэтых прадуктаў яны нават не каштавалі. Таму раю ўсім разнастаіць рацыён сваёй сям'і, у ліку іншага дадаць у яго перапёлак, лівер, хатнія сыры, расткі пшаніцы, сельдэрэй, пастарнак, маш, сачавіцу, нут... Прычым для гэтага не патрэбна шмат грошай.

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**На 31 декабря 2017 года**

| | |
|---|---|
| Организация | ОАО «Белсчеттехника» |
| Учетный номер плательщика | 100064838 |
| Вид экономической деятельности | Ремонт машин и оборудования общего и специального назначения |
| Организационно-правовая форма | Акционерное общество |
| Орган управления | Совет Директоров |
| Единица измерения | тыс. руб. |
| Адрес | 220114, г. Минск, ул. Ф. Скорины, 14-226 |

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2017 года | На 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 17 646 | 18 324 |
| Нематериальные активы | 120 | 49 | – |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 1 | – |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 1 | 1 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **17 697** | **18 325** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 1477 | 1041 |
| в том числе: материалы | 211 | 1299 | 859 |
| готовая продукция и товары | 214 | 178 | 182 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 16 | 107 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 8 | – |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 1788 | 1015 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | – | – |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 382 | 113 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **3671** | **2276** |
| **БАЛАНС** | **300** | **21 368** | **20 601** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **На 31 декабря 2017 года** | **На 31 декабря 2016 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 8776 | 8776 |
| Резервный капитал | 440 | 1 | 1 |
| Добавочный капитал | 450 | 6421 | 6453 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 1538 | 1544 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **16 736** | **16 774** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 2472 | 1480 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 18 | – |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **2490** | **1480** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 1516 | 1224 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | – | – |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 626 | 944 |
| в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | – 6 | – 274 |
| по авансам полученным | 632 | 115 | 101 |
| по налогам и сборам | 633 | 255 | 329 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 55 | 62 |
| по оплате труда | 635 | 160 | 138 |
| прочим кредиторам | 638 | 35 | 40 |
| Доходы будущих периодов | 650 | – | 179 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **2142** | **2347** |
| **БАЛАНС** | **700** | **21 368** | **20 601** |

**ОТЧЕТ**
**о прибылях и убытках**
**за январь – декабрь 2017 года**

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 года | За январь – декабрь 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 8 228 | 8 054 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (6710) | (6442) |
| Валовая прибыль | 030 | 1518 | 1612 |
| Управленческие расходы | 040 | (865) | (793) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 653 | 819 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 272 | 577 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (1 018) | (896) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | (93) | 500 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 172 | 124 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 126 | 1 |
| проценты к получению | 103 | 13 | 37 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 33 | 86 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (155) | (87) |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (134) | (1) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (21) | (86) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 366 | 468 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 366 | 468 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (306) | (974) |
| в том числе: проценты к уплате | 131 | (61) | (175) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (245) | (799) |
| **Наименование показателей** | **Код строки** | **За январь – декабрь 2017 года** | **За январь – декабрь 2016 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | 77 | (469) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | (16) | 31 |
| Налог на прибыль | 160 | (4) | (31) |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | (18) | – |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | (38) | – |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | 32 | |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | (6) | – |

Руководитель В. Ф. Хацкевич

Главный бухгалтер В. Н.Астапов

27 марта 2018 г.

**Аудитор – индивидуальный предприниматель Шитикова Елена Вацлавовна**
**УНП 190087364; квалификационный аттестат № 0001032**
**выдан Минфином РБ 26.08.2003 г.;**
**Адрес: г. Минск, ул. Руссиянова, 12/17; моб. 8 029 750 38 52;**
**Расчетный счет 3013561750011 в ОАО «Белинвестбанк» ЦБУ 527 г. Минска**
**ОАО «Белинвестбанк», код 153001739, г. Минск, ул. Ленина, 16.**

23 марта 2018 г. г. Минск
Исх. № 02/03

**Аудиторское заключение по индивидуальной бухгалтерской отчетности**

Открытого акционерного общества «Завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники» (ОАО «Белсчеттехника»). За период с 1 января 2017 года по 31 декабря 2017 года.

Генеральному директору ОАО «Белсчеттехника» В. Ф. Хацкевичу.

Местонахождение: 220114, г. Минск, ул. Скорины, д. 14, к. 226.

Открытое акционерное общество «Завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники», создано приказом Минского городского комитета по управлению государственным имуществом и приватизации Республики Беларусь от 21.12.1994 г. № 421 путем преобразования государственного предприятия «Минский опытно-экспериментальный завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники» в соответствии с законодательством о приватизации государственной собственности и законодательством об акционерных обществах, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100064838, сокращенное наименование: ОАО «Белсчеттехника». Общество реорганизовано в форме присоединения к нему открытого акционерного общества «Каскад-93», зарегистрированного решением Минского горисполкома от 29.09.2000 г. № 1099, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100016908.

Аудиторская организация: **аудитор** – индивидуальный предприниматель Шитикова Елена Вацлавовна. Юридический адрес: 220141, Беларусь, г. Минск, ул. Руссиянова, 12/17. Телефон/факс: 8 029 750 38 52.

**Квалификационный аттестат № 0001032,** выданный на основании приказа Министерства финансов Республики Беларусь от 26.08.2003 г.

**Свидетельство о государственной регистрации № 0011600** от 4 апреля 2000 года. Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190087364.

**Заключение по бухгалтерской отчетности**

Мною проведен аудит прилагаемой бухгалтерской отчетности ОАО «Белсчеттехника», состоящей из бухгалтерского баланса на 31 декабря 2017 г., отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также примечаний к бухгалтерской отчетности за 2017 год.

**Обязанности руководства аудируемого лица по подготовке бухгалтерской отчетности**

Руководство ОАО «Белсчеттехника» несет ответственность за составление и представление бухгалтерской отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности и организацию системы внутреннего контроля, необходимой для составления бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок.

**Обязанности аудиторской организации**

Я несу ответственность за выраженное мною аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Мною проведен аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, которые обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской отчетности.

В ходе аудита мною были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей бухгалтерской отчетности ОАО «Белсчеттехника», а также другую раскрытую в ней информацию. Выбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской отчетности мною рассматривалась система внутреннего контроля ОАО «Белсчеттехника», необходимая для составления бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок и общего содержания бухгалтерской отчетности ОАО «Белсчеттехника».

Я полагаю, что в ходе аудита мною были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

**Аудиторское мнение**

По моему мнению, бухгалтерская отчетность ОАО «Белсчеттехника», сформированная в соответствии с требованиями законодательства по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отчетность аудируемого лица отражает его финансовое положение на 1 января 2018 года, финансовые результаты его деятельности и изменения его финансового положения (движение денежных средств) за 2017 год в соответствии с применимой основой составления и представления индивидуальной бухгалтерской отчетности.

(Руководитель или иное уполномоченное лицо аудиторской организации или аудитор, осуществляющий деятельность в качестве индивидуального предпринимателя).

Е. В. Шитикова

(Дата подписания аудиторского заключения по бухгалтерской отчетности)
23 марта 2018 г.

# «ЕШЦЕ СЕЛЯДЗЕЦ, РАДУЙЦЕСЯ І СПЯВАЙЦЕ»

## Заснавальніца праекта «Радзіны» пра патрэбы жанчыны ў родах ды доўгачаканы прыезд Мішэля Адэна

**Вераніка ЗАЎЯЛАВА па прафесіі юрыст. Пасля таго як нарадзіла другое дзіця, ёй захацелася больш актыўна дапамагаць іншым жанчынам, дзяліцца сваімі ведамі і досведам. Так тры гады таму на свет з'явіўся інфармацыйна-асветніцкі праект «Радзіны».**



Мішэль АДЭН у Кіеве з украінскімі перынатальнымі спецыялісткамі.

***— Вераніка, з якімі пытаннямі да вас як да юрыста, які спецыялізуецца на тэме дзетанараджэння і цяжарнасці, часцей за ўсё звяртаюцца жанчыны?***

— Апошнім часам яны звяртаюцца да мяне больш як да псіхолага *(смяецца)*. Ну, напрыклад, тэлефануюць і пытаюцца: «Як мне памяняць доктара ў жаночай кансультацыі?» Кажу ім, што правы пацыента даволі дасканала сфармуляваны ў законе «Аб ахове здароўя», у тым ліку і права выбару медыцынскага работніка. Але шмат залежыць ад вашага ўмення дамаўляцца і камунікаваць. Мая задача часта заключаецца ў тым, каб надаць цяжарнай упэўненасць у сваіх сілах, дапамагчы сфармуляваць патрэбы. Але, вядома, трэба і ведаць, як абараніць свае правы, выкарыстоўваючы адміністрацыйныя працэдуры.

А вось права выбару доктара і акушэркі ў нашых раддамах рэалізуецца пакуль вельмі рэдка. Большасць беларусак нараджае з дзяжурнай брыгадай. Дай бог здароўя тым людзям, якія, прынамсі ў 6-м сталічным і ў Гродзенскім раддамах, далі магчымасць жанчынам афіцыйна выбіраць урача, пазнаёміцца з ім загадзя. Калі ты ведаеш чалавека, які будзе прымаць у цябе роды, то адчуваеш сябе ў бяспецы, больш упэўнена.

Думаю, адным з магчымых варыянтаў рашэння гэтай праблемы было б аб'яднанне жаночых кансультацый з раддамамі. Мы летась правялі сацыялагічнае апытанне сярод жыхарак Мінска і абласных гарадоў. Дык вось жанчыны хацелі б, каб тыя ўрачы, якія суправаджаюць іх падчас цяжарнасці ў жаночай кансультацыі, прымалі ў іх роды.

***— Ведаю, што вы папулярызуеце сярод беларускіх цяжарных такі інструмент, як «План родаў». Можаце расказаць пра яго падрабязней?***

— План родаў — гэта пісьмовая заява жанчыны аб тым, дзе, з кім і як яна хоча нараджаць. Такі дакумент актыўна выкарыстоўваецца цяжарнымі многіх краін для ўзгаднення сваіх інтарэсаў у аказанні медпаслуг у родах. У паняцце «як» уваходзіць: партнёрскія роды ці без суправаджальніка (мужа, мамы, сястры, сяброўкі, іншага чалавека), згода або адмова ад прымянення стымулюючых ці абязбольвальных медыкаментаў, час перарэзання пупавіны, згода ці адмова ад прышчэпак і іншае. Улічваючы, што роды не найлепшы час для таго, каб займацца ўзгадненнем нейкіх пажаданняў, раю ўсё гэта зрабіць загадзя.

> **«Будучай маці варта забяспечваць сабе пэўны ўнутраны спакой і здаровы лад жыцця. Пра гэта павінна паклапаціцца не толькі сама цяжарная, але і тыя, хто яе акружае».**

***— На ваш погляд, нараджаць лепш з партнёрам ці без?***

— Лепш з партнёрам. У клінічных пратаколах ёсць выдатныя нормы, што жанчыне трэба забяспечваць немедыцынскае абязбольванне ў родах. Яна павінна мець магчымасць рухацца, схадзіць у душ. Але ў гэтым часта патрэбна дапамога. Ахто гэта будзе рабіць, як не партнёр? Калі ты ляжыш на спіне пад кропельніцай аксітацыну (гэта досвед маіх першых родаў), ствараюцца ўсе ўмовы для паталагічнага, вельмі страшнага болю, які спыняе роды. Калі можна мяняць пазіцыі, свабодна дыхаць, разняволіцца і адчуваць сябе ў бяспецы (так праходзілі мае другія роды), то гэты боль — вельмі зямны, перажывальны. У нейкі момант партнёр табе зробіць масаж, заварыць цёплай гарбаткі, абдыме, супакоіць... Прысутнасць побач знаёмага чалавека ўсяляе ўпэўненасць і спакой. Калі няма напружання, страху ды паталагічнага болю, — ад родаў можна нават задавальненне атрымліваць.

Праўда, у Беларусі не вельмі распаўсюджаныя партнёрскія роды. Па выніках даследавання мы ўбачылі, што толькі каля 16 % апытаных нараджаюць з партнёрамі. У больш як 90 працэнтах выпадкаў гэта ўсё ж такі муж. У той жа час жанчыны кажуць пра тое, што калі б было менш перашкод, то нараджалі б з партнёрам болей за 60 %. Пры гэтым яны хацелі б усё ж такі мець магчымасць выбару, каб гэта быў не толькі блізкі сваяк, але і прафесійная памочніца ў родах, якой яна давярае і з якой можа адчуваць сябе ў бяспецы. Бо не заўсёды нехта са сваякоў гатовы да партнёрскіх родаў.

***— Можаце расказаць пра ўласны досвед партнёрства ў родах?***

— 5 гадоў таму я для сябе арганізавала роды з доўлай. У яе быў пэўны досвед у немедыцынскім суправаджэнні цяжарных, яна псіхолаг па адукацыі. Калі я прыйшла дамаўляцца пра гэта ў раддом і сказала, што ў якасці партнёра ў родах будзе выступаць не муж (муж займаўся іншымі справамі, якія таксама былі важныя для мяне), было шмат непаразумення. Давялося шмат хадзіць і тлумачыць. У выніку я знайшла паразуменне ў загадчыцы раддома. Але гэта быў няпросты шлях. Раз персанал раддома здзіўляецца пажаданню выбару партнёркі ў родах ці запыту свабоды выбару позы ў родах і інш., значыць, жанчыны не даносяць свой запыт, што ж ім усё ж такі неабходна. І гэта дрэнна.

Роды адной, маючы толькі медыцынскае суправаджэнне (мае першыя роды) і роды ў якасці індывідуальнай паслугі з падтрымкай партнёркі (другія роды) — гэта вялікая розніца. Гэта мае значэнне для здароўя і маці, і дзіцяці. Пра гэта сведчаць і навуковыя даследаванні, і міжнародныя рэкамендацыі ў сферы родадапамогі, і асабісты досвед жанчын.

***— Ведаю, што «Радзіны» актыўна дапамагаюць цяжарным, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі, у тым ліку ў межах праекта «Ты не адна». Што яшчэ карыснага рыхтуеце для беларускіх жанчын?***

— Зусім нядаўна мы з аднадумцамі стварылі рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне падтрымкі сям'і «Нараджэнне». Шмат планаў на будучыню ў сферы асветніцтва, развіцця прафесій і паслуг, падтрымкі для жанчын падчас цяжарнасці, родаў і мацярынства. Але ў дадзены момант жыву прадчуваннем прыезду славутага доктара-акушэра з Вялікабрытаніі Мішэля Адэна. У лютым мы правялі тэлемост пра патрэбы жанчын падчас родаў з яго ўдзелам. Відэазапіс зараз знаходзіцца ў сеціве ў свабодным доступе. Што вельмі прыемна, пасля тэлемоста Мішэль Адэн атрымаў запрашэнне ад нашага Міністэрства аховы здароўя ўдзельнічаць у Кангрэсе па праблемах рэпрадуктыўнай медыцыны. Акрамя гэтага, мы ладзім 26 красавіка яго сустрэчу з усімі ахвотнымі — жанчынамі, сем'ямі, спецыялістамі. Падобны дзённы трэнінг-семінар «Лёгкія роды і нараджэнне здаровага дзіцяці» пройдзе ў нашай краіне ўпершыню.

***— Чаму прыезд Мішэля Адэна такі значны для нашай краіны?***

— Падчас другой цяжарнасці мне трапіла ў рукі кніга спадара Адэна «Адраджэныя роды». А два гады таму я наведала семінар, які гэты легендарны чалавек праводзіў у Кіеве. Пасля вяртання дадому прачытала ўсе яго кнігі, якія ёсць у перакладзе. І мне захацелася дзяліцца яго ведамі. Таму паслала некалькі кніг пра кесарава сячэнне, эвалюцыю і роды ў нашы беларускія ўніверсітэты. Увогуле часта дару іх медыкам. Мішэль Адэн вельмі дасведчаны доктар акушэр-гінеколаг, навуковец, даследчык. Ён змяніў да лепшага сусветную акушэрскую практыку і дае веды пра роды і здароўе людзям па ўсім свеце. У ліпені яму споўніцца 88 гадоў. Але той прафесійны расклад, які ён мае, — удзел у розных мерапрыемствах, напісанне кніг — проста ўражвае.

Мы доўга вялі перамовы з Мішэлем, натхняючы яго на прыезд у Беларусь. Ведаеце, што было адной з перашкод і што паспрыяла гэтаму візіту? Быў візавы рэжым. Гэта перашкода для чалавека, які шмат ездзіць па ўсім свеце: аддаваць некуды свой пашпарт, марнаваць час. А зараз ёсць пяцідзённы бязвізавы перыяд, на гэтыя пяць дзён ён і прыедзе.

> **«Жанчыны хацелі б, каб тыя ўрачы, якія суправаджаюць іх падчас цяжарнасці ў жаночай кансультацыі, прымалі ў іх роды».**

Дарэчы, некалькі гадоў таму Мішэль Адэн прыязджаў у Расію па запрашэнні міжведамаснай групы ў сферы нацыянальнага праекта па ахове здароўя і дэмаграфічнай палітыцы і бяспецы. Гэта значыць, яго веды выкарыстоўваюцца і ў распрацоўцы дэмаграфічнай палітыкі, якая ў прыярытэце і ў нас.

У яго ёсць адказы на самыя розныя пытанні. Як зацяжарыць? Як пражываць перыяд цяжарнасці і родаў, каб захаваць здароўе — сваё і дзіцяці? Як падрыхтавацца да родаў? Чаму жанчыны нараджаюць цяжка? Як нарадзіць лёгка? Спецыялістам ён кажа пра работу гарманальнай сістэмы, эпігенетыку, эпідэміялогію, фарміраванне мікрабіёма, умовы бяспечнасці аперацыйнага ўмяшання ў роды (аперацыя кесарава і інш.). Ён у курсе ўсіх самых сучасных даследаванняў, якія ёсць у сферы дзетанараджэння.

Але самае галоўнае, ён дае навукова абгрунтаваныя рэкамендацыі адносна ўніверсальных патрэб жанчыны ў родах. Сярод іх адсутнасць яркага святла ды неабходнасці думаць і размаўляць, адчуванне бяспекі. Менавіта гэтую інфармацыю, на мой погляд, трэба даносіць да нашых спецыялістаў. Гэта здаецца вельмі простым. Але важна зразумець гэтую прастату. І гэта прастата, якая прайшла праз складанасць: некалькі дзесяцігоддзяў акушэрскай і навуковай працы.



Вераніка ЗАЎЯЛАВА з сынам Андрэем і дачкой Камілай закрываюць сезон зімовай рыбалкі пад Браславам.

***— Вераніка, што б вы параілі жанчыне, якая першы раз зацяжарыла?***

— Мне падабаецца фраза Мішэля Адэна: «Жанчыне, каб добра нарадзіць, трэба быць як мага больш здаровай і шчаслівай». І парада зноў жа ад яго: «Ешце сардзіны, радуйцеся і спявайце». Дарэчы, для расіян некалькі гадоў таму Адэн адаптаваў яе, казаў «Ешце селядзец...». Каб сардзіны доўга не шукаць *(усміхаецца)*. Трэба ствараць для сябе такія ўмовы, каб радасці было больш, а трывогі менш. Пра гэта піша ў сваёй кнізе «Радзільныя звычаі і абрады Беларусі» і даследчыца Таццяна Кухаронак. Там шмат пра тое, што традыцыйна было прынята: будучай маці варта забяспечваць сабе пэўны ўнутраны спакой і здаровы лад жыцця. Пра гэта павінна паклапаціцца не толькі сама цяжарная, але і тыя, хто яе акружае. Шукайце маладых маці з пазітыўным досведам, кансультантаў, якія могуць даць упэўненасць і спакой. Чытайце спецыялізаваную літаратуру, але толькі правераную. Бо разуменне жанчынай таго, што з ёй адбываецца, можа зрабіць роды больш лёгкімі, мінімізаваць імавернасць медумяшання. І паклапаціцеся загадзя пра спрыяльныя ўмовы для сваіх родаў. Зараз, дзякуй богу, у і нашай краіне ёсць розныя магчымасці. Ствараюцца нават «хатнія» палаты. Хоць, праўда, дарагія пакуль. І прыходзьце 26 красавіка дзеля ведаў і натхнення на сустрэчу з Мішэлем Адэнам у Мінску (падрабязнасці на oden.radziny.by).

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Сямейная пошта

# БАБУЛІНА НАВУКА

**Раней людзі былі больш уважлівымі. Назіралі за рознымі прыроднымі з'явамі. Гэта была іх надзённая патрэба, бо ў большасці сялянскіх дамоў нават гадзіннікаў не трымалі. Тым не менш мая бабуля магла вызначыць час не толькі днём, але нават ноччу. Тую, народную, мудрасць перадала і мне.**

Памятаю, калі я ў маленстве пасвіла кароў, то мерала сваім крокам даўжыню ценю: станеш так, каб ён падаў перад табой, запомніш, дзе канчаецца, і ідзеш. Чатыры крокі — дамоў на абед заганяць каровак.

У раннім дзяцінстве я ўжо магла хутка знайсці на небе Мядзведзіцу. Бабуля яе называла «Апалонічак», або «Вядзерца з карамыслечкам». А іншы раз казала на гэтыя чатыры зорачкі «Сіцечка». Вечарам ці ноччу магла дакладна вызначыць час па тым, як павярнулася гэтае «Сіцечка», ці «Вядзерца».

«Калі ўбачыш, як зорачка «падае» з неба, то гэта нехта памёр і яго душачка пакацілася. Трэба абавязкова прыпыніцца, перахрысціцца і сказаць: «Душы — неба». Так бацькі вучылі сваіх дзяцей з павагай і добразычлівасцю ставіцца нават да невядомага табе чалавека.

Перад Калядамі на Куццю — гэта была самая знатная вячэра, хоць і посная, — сядалі за стол, калі з'яўлялася вячэрняя зорка. Гэта дысцыплінавала, прывучала да парадку. Пад настольнікам было сенца, якое ранічкай неслі кароўцы. Рагуля заўсёды шанавалася ў сям'і, бо яна карміла кожны дзень. Стараліся выганяць яе ў поле як мага раней. Казалі, калі кароўка з расіцай травы пад'есць, то падужэе і малачка больш дасць.

А з якой павагай адносіліся да птушак! О! Як забаранялася разбураць птушыныя гнёзды! Калі скінеш ластаўчына гняздо, то рабацінне пакрые ўвесь твой твар — так страшылі дзяцей і адначасова расказвалі пра карысць птушак. Каб іх не было, то не мелі б людзі ні ягадкі, ні яблычка — усё б чарвякі з'елі.

Лічылася, што калі бусел паселіцца каля тваёй хаты, то, хутчэй за ўсё, шчасце не мінае, а калі бусел пакідае гняздо, то няшчасці згінуць. А яшчэ бабуля казала: як даўганогі ляцець, у любы дзень, то запытайся ў яго, якое будзе надвор'е: «Бусел-калода, што заўтра будзе, дождж ці пагода? (Пагода — гэта добрае надвор'е.) Калі птушка паляціць плаўна, не махаючы крыламі, то будзе суха, а калі будзе махаць, то чакай вятрыску і, магчыма, дождж. Вядома, гэта буслінае прадказанне наконт надвор'я не заўсёды супадала. Як я зараз разумею, так старыя людзі проста вучылі дзетак назіраць за птушкамі. А вось калі ластаўкі нізка лётаюць, то дождж будзе абавязкова.

Жывучы ў вёсцы, шмат чаго трэба ведаць. Каб пасеяць у пару ды ўраджай сабраць своечасова, абавязкова трэба ўмець прадказваць надвор'е. «У маі суха — падцягвай бруха» (значыць, будзе неўраджайны год), — гэтую фразу я часта чула ў дзяцінстве. А бывала, уваходзіць бабуля ў хату і кажа: «Ну, пацяплее: вецер закінуў са Скідзеля (гэта поўдзень)». А калі з Бабраўні закіне, то, значыць, пахаладае (поўнач).

Прадказаць непагоду было вельмі важна, асабліва тады, калі сушылі сена. Мая бабуля, напрыклад, разбіралася ў кветках: якія закрываюцца перад даждждом, якія пад вечар. У нас у вёсцы таксама казалі: «Прыйдзе Ілля — наробіць гнілля», ведалі, што ў гэты час часта ідуць дажджы, таму стараліся нарыхтаваць сена ў больш прыдатныя дні.

Якім будзе надвор'е, вызначалі і па месяцы. Калі ў яго «рожкі» востраныкія, то будзе ясна, суха, а калі тупыя ці месячык, як быццам туманам зацягнуты, — чакай непагадзі. Бабуля навучыла мяне: «Як убачыш першы раз малады месячык, то трэба ў яго папрасіць здароўечка:

*Маладзенькі месячык,*
*Маладая зорачка!*
*Табе на прыбытачак,*
*А мне на здароўечка».*

Дык нават цяпер, калі ўбачу малады месячык на небе, у думках прамільгнуць гэтыя бабуліны словы...

**Яўгенія КУЛЕВІЧ,**
*в. Сялец, Смаргонскі раён.*

■ Незвычайнае хобі

# Мара пра ўсходні сад

## ЯК СПАРТСМЕН СТАЎ МАЙСТРАМ БАНСАЙ

**«Напэўна, у мінулым жыцці я быў кітайцам, — жартуе Аляксандр КАРНЯЛЮК. — Мне вельмі блізкая азіяцкая культура». Былы лёгкаатлет, у маладосці ён хутчэй за ўсіх у Савецкім Саюзе прабягаў стаметроўкі. Але больш за 20 гадоў таму кардынальна змяніў сферу дзейнасці. Цяпер, у свае 67, ён захапляецца мастацтвам бансай. Вырошчвае карлікавыя дрэвы ў талерках, каб круглы год любавацца дома зялёным садам.**



Спорту Аляксандр аддаў 45 гадоў свайго жыцця. Спачатку выступаў сам. Быў чэмпіёнам СССР на дыстанцыі 100 метраў. У 22 гады паехаў на Алімпіяду ў Мюнхен (1972 год), дзе ў эстафеце разам з іншымі лёгкаатлетамі заваяваў сярэбраны медаль. А вось на наступныя гульні трапіць не змог.

— Для мяне гэта была вялікая трагедыя. У 26 гадоў я скончыў кар'еру спрынтара і стаў трэнерам зборнай каманды Саюза. Мне было цікава рыхтаваць іншых спартсменаў.

Падапечныя Аляксандра выйгравалі эстафету на Алімпіядзе, станавіліся чэмпіёнамі Еўропы. Але пасля аднаго з чэмпіянатаў вынікамі лёгкаатлетычнай каманды наверсе засталіся незадаволеныя, разагналі трэнераў і сабралі новы склад. Працаваць на больш нізкім узроўні мужчыну не хацелася. Да таго ж у якасці трэнера ён не бачыў для сябе перспектыў. «Вельмі моцна прагрэсіравалі ў спрынце амерыканскія спартсмены, і беламу чалавеку там месца практычна не засталося. А плыць па цячэнні мне было нецікава», — тлумачыць Аляксандр.

Мужчына вырашыў адкрыць у Мінску прыватны спартклуб.

— У мяне там былі лёгкаатлеты з Украіны, Літвы, Латвіі. Адным словам, сабраў эліту, — успамінае Аляксандр. — Знайшоў спонсараў. Плаціў спартсменам добрыя на тыя часы стыпендыі, каля тысячы долараў. Тады камерцыйны спорт толькі развіваўся. За ўздзел у спаборніцтвах атлеты атрымлівалі фінансавую падтрымку ў памеры 5—10 тысяч долараў у залежнасці ад рэйтынгу. Цяпер, вядома, лічбы вышэйшыя.

У 45 гадоў Аляксандр у выніку сышоў са спорту. Пераехаў за горад, ва Уздзенскі раён, каб рэалізаваць сваю іншую мару — зрабіць японскі сад. Кажа, што азеляненнем захапляўся даўно: яшчэ ў мінскай кватэры на лоджыі ў яго быў зімовы сад.

Цяперашні куток прыроды зусім іншых памераў.

— Палову дома захапіў, — смяецца мужчына. — Сад вялікі, 100 «квадратаў» займае. Я нацягаў туды зямлі — машын пяць, напэўна, — расклаў камяні. Зрабіў прыродны ландшафт розных зон — ёсць і горны пейзаж, і пустынны з кактусамі. Вырошчваю мандарыны, фейхоа, гранат. Сад знаходзіцца на паўднёвым баку дома, а пад ім — падвальнае памяшканне, якое ацяпляецца. Бэлькі закрыў полікарбанатам. Знізу цяпло ідзе, зверху сонца свеціць — добры мікраклімат атрымаўся.



Пераехаўшы за горад, былы спартсмен захапіўся мастацтвам бансай. Першым карлікавым дрэвам, якое ён вырасціў, стала сасна. Ёй ужо 25 гадоў. Ёсць у калекцыі Аляксандра граб, ліпа, японскі клён, гранат, дуб. А яшчэ мініяцюрная яблыня, на якой растуць сапраўдныя яблычкі, праўда, памерам з чарэшню. «Ці смачныя? Шчыра — не каштаваў», — усміхаецца мужчына.

Саджанцы ён любіць шукаць у лесе па вясне. Пасля зімы некаторыя дрэўцы, якія былі прыціснуты снегам, маюць цікавую форму. Добра падыходзіць граб, бо яму лёгка надаць патрэбную форму.

Будучы бансай Аляксандр саджае ў талерку. Вырошчвае па тэхналогіі гідрапонікі: асноўнае жыўленне дрэва атрымлівае не з грунту, а з вадкага комплекснага ўгнаення з мікраэлементамі. Таму яно можа расці пры мінімальнай колькасці зямлі і яму не патрэбна вялікая каранёвая сістэма.

— Догляд бансая патрэбны кожны дзень. Ён не з тых хатніх раслін, якія можна ўзяць і на тыдзень забыць. Калі некуды з'язджаю, даручаю дрэвы сваім памочнікам, — кажа Аляксандр.

**«Агарода ў мяне няма. Я люблю хадзіць у сад і любавацца ім, а не працаваць на ўраджай».**

Майстар умее таксама вырошчваць дрэвы на камені: робіць на ім расколіну і памяшчае туды маленькі саджанец.

Па яго словах, каб з парастка атрымаць бансай, трэба гадоў сем.

— Вы, пэўна, вельмі цярплівы чалавек.

— Разумееце, у мяне няма такой мэты — хутчэй вырасціць бансай. Я не спрабую паскорыць вынік, мне падабаецца назіраць за працэсам.

Цікава, што Аляксандр зусім не дачнік у класічным разуменні. Плантацыі памідораў і гуркоў — гэта не пра яго. «Агарода ў мяне няма. Я люблю хадзіць у сад і любавацца ім, а не працаваць на ўраджай».

Захапленне мастацтвам бансай ён змог ператварыць у спосаб заробку. Карлікавымі дрэвамі ён афармляў некаторыя са сталічных гатэляў. На пытанне «Хто ж там бансай даглядае?» тлумачыць, што заключае з гасцініцамі дагавор на абслугоўванне і раз на тыдзень-два мяняе дрэўцы. Пакуль адны з іх радуюць гасцей, іншыя «рэабілітуюцца» ў Аляксандра дома.

Дарэчы, пра «ўнутранага кітайца». На свой 60-гадовы юбілей мужчына якраз трапіў у Кітай. І хоць не ведаў мовы, адчуваў там сябе вельмі камфортна. Усе 10 дзён, што правёў у той краіне, быў на ўздыме.

— Мне падабаецца культура сузірання. Шкада, што нам яе не хапае. Мы пастаянна занятыя работай, сям'ёй, іншымі клопатамі. Але добра было б знаходзіць час пабыць сам-насам з прыродай, атрымаць асалоду ад яе. Гэта дае ўнутраны супакой.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

❍ У ТЭМУ

### Мужчыны таксама... вяжуць

Сярод мужчынскіх захапленняў бываюць не толькі рыбалка, хакей і шахматы. Мы склалі падборку арыгінальных для мужчын хобі.

***Вязанне.*** Цікавы факт: у 1946 годзе нацыянальны амерыканскі конкурс па вязанні кручком выйграў менавіта мужчына. Але такое магчыма не толькі ў Штатах. Напрыклад, жыхар Вілейкі Васіль Чыжыкаў-Кузьмін з дапамогай кручка стварае шапкі, рукавіцы і шалікі. Дагэтуль ён захапляўся пляценнем з вяровак бранзалетаў. А калі трапіў у бальніцу, вырашыў асвоіць і вязанне. З палаты даўно выпісаўся, а хобі засталося. У працоўным наборы мужчыны некалькі кручкоў рознай таўшчыні і кнігі па рукадзеллі.

***Бісер.*** Расіянін Вячаслаў Ціток (інжынер авіякампаніі) «падсеў» на гэты занятак па прыкладзе дачкі і жонкі. Мужчына падганяў іх скончыць адну карціну, каб хутчэй павесіць яе на сцяну, вось спадарыні і заявілі: «Дарабі сам, калі так хочаш». Вячаслаў і ўзяўся за справу. А пасля замахнуўся на карціну з 65 тысяч бісерынак. Вышыўка імі так захапіла мужчыну, што ён ездзіць цяпер са сваімі работамі на конкурсы і выстаўкі.

***Вышыўка стужкамі.*** Гэта было любімае хобі караля Францыі Людовіка XV. Ён часта дарыў прыдворным дамам свае вырабы ў якасці знака ўвагі.

***Фларыстыка.*** Лідскі тэхнік-электронік Віталь Клімянкоў ужо некалькі гадоў складае вясельныя букеты. Ён самавук, ніякіх курсаў не заканчваў. Ствараць кветкавыя кампазіцыі дапамагае інтуіцыя і ўласнае пачуццё прыгожага. Віталь любіць збіраць аб'ёмныя букеты, дзе шмат зеляніны, па якія да яго звяртаюцца не толькі лідчане, але і жыхары іншых гарадоў.

# СЕЗОНЫ ВЕРЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

«ГЭТА канец майго жыцця, — кажа яна. — Усё важнае ўжо было і прамінула. Дзяцінства, голад, вайна, каханне, дзеці. Татку расстралялі немцы. Мама тады была цяжарная Галінай, ды нас чацвёра. У памяць пра тату я захоўваю саматканы пояс. Ён ніколі нас не біў, але я была той яшчэ шкодніцай, і аднойчы ён мяне прыстрашыў: як не перастанеш шкоду рабіць, дык добра ад мяне атрымаеш. Я спужалася ды ўжо больш не шкоднічала.

Упершыню пабачыла сябе ў люстэрка, калі мне было гадоў дзесяць. Мы мясцовым яўрэям шчаўе прадавалі. А ў іх дома люстэрка вісела. Я замаркоцілася, калі пабачыла свой адбітак, бо была бледная, хударлявая, у непрыгожую сукенку адзетая. Прыбегла дахаты і плачу. Мама падвяла мяне да вядра з вадою ды сказала, што я самая прыгожая.

**«Вось ужо думаю: пара пачынаць раздаваць свае сукенкі. Нашто яны мне? Калі памру, усё павыкідаюць. А так я сама людзям аддам».**

За мяшэчак шчаўя нам плацілі пяць капеек. Мы з сястрой купілі пацеркі. Я выбрала салатавага колеру. Пайшла па ваду да студні, схілілася, каб зірнуць, глыбока там ці не, — і бах, мае пацеркі паляцелі долу. Мусіць, і дагэтуль там ляжаць. Як доўга я плакала!

Колькі ўсяго было за тыя гады! Сама дабівалася і атэстата, і працы. Тады асаблівай пісьменнасці ніхто і не вымагаў. Чатыры класы польскай школы, потым прыйшлі Саветы, правучылася адзін год, потым немцы прыйшлі. Да іх у школу я не пайшла. Яны ў юнакі сталі запісваць (маецца на ўвазе арганізацыя «Саюз беларускай моладзі», створаная акупацыйнымі ўладамі. — **Аўт.**). Гэта як піянеры за Саветамі. Я і яшчэ некалькі хлапцоў спужаліся ды ўцяклі. Па вайне скончыла 10 клас у вячэрняй школе. Я ўжо працавала тады ў пашпартным стале. Мела добры почырк, дык мяне адразу ўзялі.

З'явіліся грошы. Я ўжо магла шыць і купляць сабе ўбранне. Сукенкі прыдумлялі самі. Фасоны змалёўвалі з мінакоў у горадзе. Мама рабіла выкрайкі. Мы з сёстрамі страчылі. Я вельмі любіла капялюшыкі. Бывала, паеду ў Мінск у камандзіроўку, абавязкова сабе новы набуду.



Вера ў сукенцы з поясам, які яна захоўвае ў памяць пра бацьку.



Вера ў паліто, якое яна набыла, калі распаўся Савецкі Саюз, каб не прапалі грошы.

Я была фарсістая. Мне падабалася апранацца прыгожа. І кавалераў у мяне была процьма. Але любіла я Сяргея, свайго мужа. Пяць гадоў з ім сябравалі. Ён убачыў мяне, калі я з прыяцелькай шпацыравалі ўзімку па вуліцы. Такая мода ў нашым горадзе была — моладзь збіралася і хадзіла туды-сюды па вуліцах. Хлопцы дзяўчат выглядалі. А потым іх дадому праводзілі.

Я «дастала» сабе плюшавае паліто. Дзядзька да гумовых боцікаў драўляныя абцасікі прыбіў. Мама завязвала мне прыгожую хусту і заколвала брошку, каб усе кветкі было відаць. Сяргей закахаўся ў тую хусцінку. Потым расказваў, што не бачыў ні мяне, ні сяброўку, а толькі кветкі на хустцы. А я думала — чаго гэты салдацік за намі ўсё ходзіць ды ходзіць? Вось так і пражылі з ім трыццаць адзін год. Траіх дзяцей нарадзілі. Жылі дружна. Сварыцца не было калі.

Была тады мода на залатыя зубы. І мне залатыя каронкі захацелася паставіць. Сяргей адгаворваў, але я ўсё адно зрабіла. Часта згадваю, як ён узяў мяне тады на калені, абняў ды сказаў, што кахае.

Сяргей памёр ад анкалогіі пасля Чарнобыля. Згарэў за некалькі месяцаў. Разам з ім памерлі і ўсе яго грошы. І я засталася адна. Дзеці яшчэ вучыліся, трэба было дапамагаць. Аддам ім усю пенсію, а сама — зубы на паліцу пакладу.



На Веры нагавіцы, якія яна купіла, калі ляжала ў бальніцы з анкалогіяй. Жанчына не любіць нагавіцы. У паўсядзённым жыцці яна аддае перавагу сукенкам і спадніцам. Але ў аддзяленні, дзе ляжала Вера, усе былі ў нагавіцах.



У сукенцы, якую ёй падарыла нявестка. Вера была ўжо на пенсіі, калі яе сын ажаніўся. Бацькі нявесткі былі супраць гэтага шлюбу. Вера пасяліла маладых у сябе і дапамагала ім гадаваць першынца.

МАЯ свякруха, як памірала, аддала мне сшыткі з малітвамі. Аднойчы я дапамагла жанчыне вылечыць палец. Проста памалілася над ёю — і боль прайшоў. Потым да мяне сталі хадзіць людзі, прасілі дапамагчы. Я згаджалася. Грошай не брала, а вось ад лусты хлеба не адмаўлялася. Так і выжывала.

Я непрыгожая, даўганосая. Але як сама сябе пахвалю, дык гляджу — і праўда прыгожая! Кожнаму твару свой нос пасуе.

**«Я вельмі любіла капялюшыкі. Бывала, паеду ў Мінск у камандзіроўку, абавязкова сабе новы набуду».**

Маладыя ўсе прыгожыя. Цэлы альбом гэтых фатаграфій. А жыццё праляцела як адзін дзень. І ў цябе праляціць.

Я вось ужо думаю: пара пачынаць раздаваць свае сукенкі. Нашто яны мне? Калі памру, усё павыкідаюць. А так я сама людзям аддам.

Улюбёнай сукенкі няма. Якую надзену, тая і ўлюбёная. Зараз я пакажу, якое ў мяне багацце! Так, я багатая, толькі няма ў мяне бацькі ды маці».

**Аўтарскі праект Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

***Усе сезоны Веры не змясціліся на адной старонцы, працяг глядзіце на сайце zviazda.by***

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 31 декабря 2017 года

| | |
|---|---|
| Организация | ОАО «Универмаг «Солигорск» |
| Учетный номер плательщика | 600024725 |
| Вид экономической деятельности | Розничная торговля и общественное питание |
| Организационно-правовая форма | Открытое акционерное общество |
| Орган управления | Солигорский райисполком |
| Единица измерения | тыс. руб. |
| Адрес | Минская обл. г. Солигорск, ул Ленина,39 |

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2017 года | На 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 3607 | 3222 |
| Нематериальные активы | 120 | 1 | 1 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | – | 462 |
| в том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | – | 462 |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | – | – |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | – | – |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 132 | 103 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 1 | 1 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | – | – |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | – | – |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | – | – |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **3741** | **3789** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 2479 | 2382 |
| в том числе: материалы | 211 | 108 | 92 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | – | – |
| незавершенное производство | 213 | – | – |
| готовая продукция и товары | 214 | 2371 | 2290 |
| товары отгруженные | 215 | – | – |
| прочие запасы | 216 | – | – |
